## «Рух-гэта жыццё» - спартыўнае мерапрыемства для людзей з абмежаванымі магчымасцямі

«Рух-гэта жыццё» пад такім дэвізам 4 верасня 2020 года прайшло спартыўнае мерапрыемства ў аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна». Ініцыятарам гэтага мерапрыемства выступіў Ашмянскі раённы фізкультурна-спартыўны клуб. Спаборніцтва праходзіла ў гарадскім парку на свежым паветры.

Выхаванцы з задавальненнем спаборнічалі ў шпаркасці, спрыту і трапнасці. Усе ўдзельнікі мерапрыемства атрымалі зарад бадзёрасці, добрага настрою і сувеніры.





